играла свою игру. Одним из инициаторов и архитектором этих разделов выступала Российская империя с ее основным внешнеполитическим вектором, обращенным к юго-западу. Что касается Правобережной Украины, то в период разделов Речи Посполитой она стала играть важную роль в геополитических планах самодержавия как объект и одновременно плацдарм их реализации.

### Библиографические ссылки


1. Велика історія України: у 2-х т. К. : Глобус, 1993. Т.2.
2. *Грушевський М. С.* Єдність чи розпад [Росії]? // Грушевський М. С. Твори: у 50 т. Львів, 2002. Т.1.
3. *Дейвіс Н.* Боже ігрище: історія Польщі. К. : Вид-во Соломії Павличко «Основи», 2008.
4. *Кареев Н. И.* «Падение Польши» в исторической литературе. СПб. : Тип. В. С. Балашева, 1888.
5. *Коваленко Л. А.* Велика французька буржуазна революція і громадсько-політичні рухи на Україні в кінці XVIII ст. К. : Вид- во Київ. ун-ту, 1973.
6. *Карамзин Н. М.* История государства Российского. М. : Книга, 1989. Книга 3: Т. IX–XII.
7. Конвенция между Россией и Пруссией о втором разделе Польши // Стегний П. В. Разделы Польши и дипломатия Екатерины II. 1772. 1793. 1795. М. : Международные отношения, 2002.
8. *Носов Б. В.* Установление российского господства в Речи Посполитой. 1756–1768 гг. М., 2004.
9. *Смолій В. А.* Возз'єднання Правобережної України з Росією. К. : Наук. думка, 1978.
10. Трактат между ея величеством императрицею Всероссийскою съ одной стороны и его величеством королем и яснейшею Речью Посполитой Польскими съ другой, подписанный в Гродне июля 11(22) дня 1793 года. СПб., 1793.


## СОЙМАВЫЯ ЛІСТЫ 1534 ГОДА ЯК КРЫНІЦА ПА СТРУКТУРЫ ВАЛЬНАГА СОЙМА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ДА РЭФОРМ 60-Х ГАДОЎ XVI СТАГОДДЗЯ


**К. Д. Даўматовіч**

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь, kirill28.02@mail.ru



У гістарыяграфіі адкрытым застаецца пытанне як выглядаў вальны сойм ВКЛ дарэформеннага перыяда (пачатак–сярэдзіна XVI ст.). З гэтым пытаннем звязана пэўная колькасць праблем, перш за ўсё – пытанне гістарычных крыніц, якія так ці інакш могуць сведчыць пра структуру органа. Не меньшай праблемай з'яўляецца фактар стракатага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ВКЛ да перыяда 60-х гг. XVI ст., з-за чаго складана выявіць з якой адміністрацыйнай адзінкі (княства, зямлі, ваяводства, староства, павета і інш.) і ў якой колькасці выбіраліся паслы на пасяджэнні вальнага сойма. Адсюль вызначаецца мэта дадзенага артыкула – абазначыць ролю соймавых лістоў 1534 г. як гістарычнай крыніцы у межах разгляда праблемы структуры вальнага сойма ВКЛ да перыяда рэформ 1560-х гг.



*Ключавыя слова*: Вялікае Княства Літоўскае; вальны сойм; соймавыя лісты; шляхта; структура.


## СЕЙМОВЫЕ ЛИСТЫ 1534 Г. КАК ИСТОЧНИК ПО СТРУКТУРЕ ВАЛЬНОГО СЕЙМА ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО ДО РЕФОРМ 60-Х ГГ. XVI ВЕКА


**К. Д. Довматович**

Белорусский государственный университет, г. Минск, Беларусь, kirill28.02@mail.ru



В историографии открытым остаётся вопрос, как выглядел вальный сейм ВКЛ в дореформенный период (начало–середина XVI в.). С этим вопросом сопряжен ряд проблем, прежде

всего – вопрос исторических источников, которые так или иначе могут свидетельствовать о структуре органа. Не меньшую проблему представляет фактор пёстрого административно-территориального деления ВКЛ до 1560-х годов, из-за чего трудно выяснить, от какой административной единицы (княжества, земли, воеводства, староства, уезда и т. д.) и в каком количестве избирались послы на заседания вального сейма. Поэтому цель данной статьи – обозначить роль сеймовых листов 1534 г. как исторического источника в рамках рассмотрения проблем устройства вального сейма ВКЛ до периода реформ 1560-е годы.

*Ключевые слова*: Великое княжество Литовское; вальный сейм; сеймовые листы; шляхта; структура.

## SEJM'S SHEETS OF 1534 AS A SOURCE ON THE STRUCTURE OF GENERAL SEJM OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE PERIOD BEFORE REFORMS OF THE 1560S

**K. Daumatovich**

Belarusian State University, Minsk, Belarus, kirill28.02@mail.ru

Current historiography still has question of how the General Sejm of the Grand Duchy of Lithuania looked like until the 60s XVI century (beginning–middle of the XVI century) as an open one. Several problems are associated with this issue, first of all – the question of historical sources, which in one way or another may provide evidence on the structure of Sejm. No less problematic is the factor of the motley administrative-territorial division of the GDL until the 1560s, which makes it difficult to find out from which administrative unit (principality, land, voivodeship, starostvo, county, etc.) and in what number ambassadors were elected to meetings of the General Sejm. Therefore, the purpose of this article is to identify the role of the sejm's sheets of 1534 as a historical source within the framework of considering the problem of the structure of General Sejm of the Grand Duchy of Lithuania before the period of reforms in the 1560s.

*Keywords*: Grand Duchy of Lithuania; General Sejm; sejm's sheets; nobility; structure.

Першая трэць XVI ст. для ВКЛ характарызуецца наступнымі рысамі. У знешнепалітычным становішчы ў Вялікага Княства абвастраюцца адносіны з Маскоўскай дзяржавай і Крымскім ханствам, што прыводзіць да шэрагу ваенных канфліктаў. Менавіта гэтыя падзеі сталі штуршком для пэўных пытанняў звязаных з ваеннай арганізацыяй і ўхвалы надзвычайных падаткаў на пасяджэннях сойма [2; 25]. Фактар цесных сувязяў з Польскім Каралеўствам праз персанальную ўнію вельмі істотна ўплываў на ўнутранапалітычнае развіццё, асабліва, шляхецкага саслоўя [1; 18]. Шляхта пастунова ўключаецца ў палітычнае жыццё краіны праз удзел на вальных соймах ВКЛ [1; 10]. На гэта таксама паўплывала і тое, што цяжар прынятых рашэнняў на соймах лажыўся на плечы гэтага саслоўя.

Ва ўнутранапалітычным развіцці ВКЛ першай трэці XVI ст. характэрны наступныя рысы. Важную ролю ў палітычнай сістэме адыгрывала кола палітычных эліт, якое, у асноўным, уваходзіла ў склад Паноў-рады. На той момант гэта быў ужо аформленны дзяржаўны орган улады, які яшчэ з XV ст. меў уплыў на вялікага князя літоўскага [12, с. 272–279; 19]. Менавіта ў першай трэці XVI ст. у палітычным жыцці ВКЛ набірае сваю моц агульны пласт землеўладальніцкага саслоўя. Гэта звязана як са знешнім фактарам (*глядзець вышэй*), так і з унутраным. На працягу перыяда канца XIV–XV стст. прымаецца шэраг дакументаў агульнадзяржаўнага і рэгіянальнага ўзроўняў (Судзебнік 1468 г., прывілеі 1387, 1432, 1434, 1447, 1492 гг., а таксама шэраг абласных і прыватных), якія афармляюць сацыяльны статус і

эканамічную глебу ўсіх землеўладальнікаў ВКЛ ад дробных да буйнешых [1]. У сваю чаргу, дадзены фактар дазволіў гэтаму саслоўю на пачатку XVI ст. прэтэндаваць на актыўны ўдзел у палітычным жыцці краіны [1].

Перад тым, як звярнуцца да крыніцы, мы абазначым наступны гістарыяграфічны момант у вывучэнні склада вальнага сойма ВКЛ. Яшчэ У.І. Пічэтам было выдзелена два кола сойма. Да першага кола гісторык адносіў прыватна запрашаных князеў, паноў, дворных і земскіх ураднікоў. Яны, разам з іншымі пасламі, складалі рыцарскае кола (шляхецкае). Да другога кола Уладзімір Іванавіч адносіў Паноў-раду [17, с. 174]. Мы жа дададзім, што на сойме было прадстаўлена і трэцяе кола – асоба вялікага князя літоўскага-караля польскага (у нашым выпадку Жыгімонт Стары). Такім чынам, вальны сойм складаўся з: 1) ужо аформленнай палітычнай эліты (Паны-рада); 2) «палітычнага народу», які толькі праходзіў пэўную стадыю развіцця (дробныя і сярэднія землеўладальнікі, ураднікі, асаблівая персоны); 3) вялікага князя літоўскага-караля польскага.

У 1534 г. паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай ў чарговы раз накаляюцца адносіны. Дзве краіны гатовяцца да вайны. Для вырашэння шэрага ваенных патынняў у студзені 1534 г. па ВКЛ расылаюцца соймавыя лісты, якія запрашаюць на ўдзел у працы вальнага сойма ў Вільне. У іх пералічына ў цэлым 63 пункты *«до»* каго яны адрасаваны (асаблівыя імёны, групы людзей) [10, Приложение, с. 22–23]. Ужо дадзеная цыфра можа сведчыць аб *«вальным»* характары сойма. Пазначаючы кола Паноў-рады, якое запрасілі на пасяджэнне 1534 г., то безумоўна вызначаюцца ваяводскія пасады ў наступных гарадах: Вільня, Трокі, Наваградак, Полацк, Віцебск, Кіеў [10, Приложение, с. 22]. Да вышэйшых асоб безумоўна адносяцца духоўныя пасады у складзе трох біскупаў (Віленскага, Луцкага і Жамойцкага) [10, Приложение, с. 22]. Таксама на сойм запрашаюцца падскарбіі земскі і дворны, якія адыгрывалі важную ролю ў фінансавых справах [10, Приложение, с. 22]. Да важных пасад, асабліва для манарха, адносяцца пералічыныя ў соймавых лістах падчашы, чашнік, крайчы, канюшы [10, Приложение, с. 22–23]. Але, калі ўлічыць, што людзі, займаўшыя дворныя пасады, больш былі дабліжаны да вялікага князя ў нефармальных адносінах (паўсядзёнае жыцце), то іх пазіцыя магла вар'іравацца ад асобы манарха да Паноў-рады ці наадварот, падчас прынняця рашэнняў. Таксама запрашалі асоб, якія маглі ўваходзіць у склад Паноў-рады «па традыцыі» свайго статуса ў краіне, як, напрыклад, князь Слуцкі [10, с. 335]. Да такіх статусных асоб, якія на сойм запрашаюцца асобна, можна аднесці пана Віленскага, пана Трокскага, пана Паца і інш. [10, с. 349; 10, Приложение, с. 22–23]. Аднак, трэба адзначыць, што не ўсе асабістыя запрашэнні давалі адразу дарогу ў склад Паноў-рады, некоторыя з князеў і паноў маглі быць радавымі прадстаўнікамі сваіх уладанняў, асабліва, у дарэформены час.

Вызначаючы кола «палітычнага народа» трэба заўважыць, што большая частка паслоў на вальны сойм запрашалася праз мясцовую адміністрацыю (ваявод, харунжых, дзяржаўцаў, стараст і інш.) [10, с. 264–265]. Так, у 1534 г. віленскаму ваяводзе, старасце Бельскаму, канцлеру і Мазырскому пану Альбрэхту Марціновічу Гаштольду акрамя ўдзелу на пасяджэнні трэба было, каб у ягоным ваяводстве і старостве ўсе харунжыя выбралі па два зямяніна «добрых людей» і каб яны адправіліся на вальны сойм у Вільне [10, Приложение, с. 22–23]. Іншае настаўленне адрасавалася полацкому ваяводзе, маршалку Яну Юр'евічу Глебовічу. Ён павінен быў выбраць двух баярыноў «людей добрых» для ўдзелу на вальным сойме. Але самаму ваяводзе трэба было застацца на месцы, што звязана з прыгранічным становішчам Полацка [10, Приложение, с. 23]. Магчыма, што запрашаючы іншых харунжых (Упіцкага, Троцкага павета па Ашмянскаму баку), дзяржаўцаў

(Мсціслаўскага, Магілёўскага, Рэчыцкага) стараст (Луцкага, Уладзіміраўскага, Пінскага, Мінскага), цівуноў (Жамойцкіх, Віленскіх) перад імі ставіліся падобныя задачы па адборы двух паслоў на месцах, але ў крыніцы гэта літаральна не адлюстравана [10, Приложение, с. 22–23]. Асобна запрашаюцца адразу цэлыя групы. Напрыклад, соймавы ліст «до князей и панов, которые именья свои по Троцкому повету по Занемонской стороне и на Подляшьи» або «до панятъ Троцъкихъ» [10, Приложение, с. 23]. На сойм запрашаліся і канкрэтызаваныя групы князеў і паноў («до панов Кухмистровичовъ», «до князей всихъ Друцкихъ», «до князей всихъ Лукомъскихъ», «до князей Свирскихъ», «до князей Кгедроптъскихъ», «до князей Сонкгушковичовъ», «до князей Збаражскихъ», «до князей Жеславскихъ», «до князей Корецъкихъ») [10, Приложение, с. 23]. Таксама ёсць згадка ліста да тэрытарыяльнай адзінкі: «по Виленскому повету по Ошъменской стороне» [10, Приложение, с. 23]. Пры гэтым не вызначаецца колькасць паслоў з групы ці адзінкі. Як запрашаюцца на вальны сойм, усе з павета ці выбіраюцца па два паслы, ў крыніцы не адлюстравана. Трэба адзначыць, што практыка выбрання па два паслы на вальны сойм адбывалася з 1511–1512 гг., але з-за недакладнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ВКЛ гэта не магло быць структураваным элементам вальнага сойма [10, с. 191; 5, с. 506]. У дарэформенны перыяд падобная прыктыка можа разглядацца як паступовы ўплыў польскай палітычнай культуры на парламенцкія стуктуры ВКЛ, якія толькі пачынаюць фарміравацца. Толькі пасля пераўтварэнняў 1560-х гг. з пэўнай доляй дакладнасці можна гаварыць пра канкрэтную працэдуру выбрання паслоў, таму што быў уніфікаваны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел краіны і зробляны мясцовыя выбарчыя інстытуты (у выглядзе павятовых соймікаў).

Да трэццяга кола вальнага сойма адносіцца персона вялікага князя літоўскага-караля польскага Жыгімонта Старога, які ў 1534 г. адаслаў соймавыя лісты да віленскага ваяводы, канцлера Альбрэхта Гаштольда і да полацкага ваяводы, маршалка Яна Глебовіча [10, Приложение., с. 22–23]. У гэтых лістах вялікі князь для кожнага акрэслівае ўмовы для ўдзелу ў працы сойма (*глядзець вышэй*). Пры гэтым вызначаецца ліст да полацкага ваяводы, які быў павінен застацца на памежжы для агляду «замков нашыхъ украинныхъ», а таксама для хуткай мабілізацыі [10, с. 265; 10, Приложение, с. 23].

Соймавыя лісты 1534 г. могуць у пэўнай ступені паказаць структуру вальнага сойма ВКЛ да рэформ 60-х гг. XVI ст. Пры аналізе гэтай крыніцы вызначаюцца тры элементы вялікакняжацкага сойма. Да першага адносіцца палітычная эліта ў складзе Паноў-рады, у якую ўваходзілі асобы, займаўшыя вышэйшыя свецкія і духоўныя пасады, а таксама шэраг персон, запрашаных «па традыцыі». Другім элементам з'яўляецца «палітычны народ» ВКЛ. Гэта, на той перыяд, найбольш пёстрая па складу частка паслоў на вальным сойме. Да яе адносяцца «люди добрые» (зямяне, баяры), якіх мясцовая адміністрацыя выбірала для ўдзелу ў сойме. Таксама да гэтай групы можна аднесці некаторых нетытулаваных прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі (цівуны) у тым ліку і харунжых. З пэўнай доляй асцярожнасці да «палітычнага народу» на момант 1534 г. можна аднесці кола княжацкіх родаў (Друцкія, Жэслаўскія і інш.), якія на сойме прадстаўляліся цэлай групай («князей», «князей всихъ»), а не «па традыцыі», як, напрыклад, князь Слуцкі. Зразумела, што група князёў з аднаго роду не магла ўваходзіць у склад Паноў-рады. Да трэцяга элемента вальнага сойма адносілася асоба манарха – Жыгімонта Старога, які ад свайго імя адсылаў соймавыя лісты да Альбрэхта Гаштольда і Яна Глебовіча. Такім чынам, прадстаўлены аналіз соймавых лістоў 1534 г. з'яўляецца спробай рэканструкцыі структуры вальнага сойма ВКЛ да рэформ 60-х гг. XVI ст.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Даўматовіч К.* «Залаты век» у палітычным развіцці шляхты Вялікага Княства Літоўскага // Ars Longa. Праграма і зборнік тэзісаў дакладаў IV міжнароднай навукова-практычнай канференцыі маладых доследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі «Ars Longa: навуковыя дасягненні і перспектывы», Мінск, 14–16 красавіка 2021 г. Мінск : Беларуская навука, 2021. С. 46–48
2. *Довматович К. Д.* Вопросы организации «земской» обороны и принятие чрезвычайных налогов на сеймах Великого Княжества Литовского первой трети XVI века // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сборник науч. статей по материалам V Междунар. научной конф., УО «ПолесГУ», Пинск 27 ноября 2020 г. Пинск : ПолесГУ, 2020. Вып. 5. С. 667–683.
3. *Довматович К. Д.* Иван Остафьевич Горностай: карьерные взлеты и падения // Материалы Международного молодежного научного форума «ЛОМОНОСОВ-2021» [Электронный ресурс] – М.: МАКС Пресс, 2021. 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM); 12 см.
4. *Довнар-Запольский М. В.* Спортные вопросы в истории литовско-русского сейма // М. В. Доўнар-Запольскі. Выбранае. Мінск : Беларуская навука, 2017. С. 380–425.
5. Документы Московского архива Минестерства юстиции. Т. 1. М. : Товарищество типографии А. И. Мамонтова, 1897.
6. *Кареев Н.* Исторический очерк польскага сейма. М. : тип. А. И. Мамонтова, 1888.
7. *Лаппо И. И.* Великое княжество Литовское во второй половине XVI столетия. Литовско-русский повет и его сеймик. Юрьев : тип. К. Маттисена, 1911.
8. *Лойка П. А.* Афармленне шляхецкага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім // Працы гістарычнага факультэта БДУ. Мінск : БДУ, 2010. Вып. 5. С. 102–115.
9. *Лойка П. А.* Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. Мінск : БДУ, 2002.
10. *Любавский М. К.* Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства. М. : Московский Университет, 1901.
11. *Любавский М. К.* Областное деление и местное управление Литовско-Русскаго государства ко времени издания первого литовскаго Статута: исторический очерк. М. : университетская тип., 1892.
12. *Любавский М. К.* Очерк Литовско-русского государства до Люблинской унии включительно. Минск. : Беларуская навука, 2012.
13. *Любый А.* Великое Княжество Литовское в белорусской историографии XX в. // Acta historica neosoliensia. Banska Bystrica: Vydavatelstvo Mateja Bela, 2020. 23/1. S. 164–178.
14. *Максимейко Н. А.* Сеймы Литовско-русского государства до Люблинской унии 1569 г. Харьков : тип. Адольфа Дарре, 1902.
15. *Падалінскі У. А.* Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай. Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017.
16. *Падалінскі У.* Палітычная эліта Лідскага павета ў апошняй трэці XVI ст. // Беларускі Гістарычны Агляд. Т. 16. Сш. 1 (30). 2009. С. 3–30.
17. *Пичета В. И.* История белорусского народа. Минск : БГУ, 2003.
18. *Пясецкий Д. В.* Формирование Ягеллонской федерации на базе союза Великое Княжество Литовское – Польша // Материалы Междунар. молодежного научного форума «ЛОМОНОСОВ-2021» [Электронный ресурс]. М. : МАКС Пресс, 2021. 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM).
19. *Пятраўкас Р.* Літоўская знаць у канцы XIV–XV ст.: Склад – структура – улада. Смаленск : Інбелкульт, 2014.
20. *Радаман А.* Іерархія ўраднікаў на сойміку Новагародскага павета Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст. // Людзі і ўлада Навагрудчыны: гісторыя ўзаемадзеяння (да 500-годдзя надання Навагрудку прывілея на магдэбургскае права): зб. навук. арт. Мінск: Беларуская навука, 2013. С. 162–177.
21. *Радаман А.* Ухвалы соймікаў і шляхецкіх з'ездаў Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў сістэме нарматыўнага рэгулявання фінансавання соймавых паслоў у другой палове XVI – пачатку XVII ст. // Вес. БДПУ. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. Мінск : БДПУ, 2005. № 4 (46). С. 16–21.
22. *Рахуба А.* Вялікае Княства Літоўскае ў парламенцкай сістэме Рэчы Паспалітай, 1569–1763 гг. – Мінск : Медысонт, 2008.
23. *Скеп'ян А. А.* Князі Слуцкія. Мінск : Беларусь, 2013. .
24. *Ходзін С. М.* Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі: дапаможнік. Мінск : БДУ, 2012.
25. *Цемушаў В. М.* На ўсходняй мяды Вялікага Княства Літоўскага (сярэдзіна XIV – першая палова XVI ст.). Смаленск : Інбелкульт, 2014.